МАЛАДАЯ ПАЭЗІЯ БЕЛАРУСІ

Наста Кудасава

РЫБЫ

МІНСК

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
К887

Серыя заснавана ў 2012 годзе

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

Кудасава, Н. Ф.

К887 Рыбы / Наста Кудасава; пад рэд. Р. Ю. Малахоўскага. — Мінск, 2013. — 64 с. — (Маладая паэзія Беларусі).

ISBN 978-985-18-1401-1.

У зборнік Насты Кудасавай «Рыбы» увайшлі выбраныя вершы з кнігі «Лісце маіх рук», а таксама новыя творы, напісаныя ў 2006—2011 гг.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5

ISBN 978-985-18-1401-1

SOLUS CUM SOLA[1]

* * *

Табой
запоўніцца
бяссонніца,
маўчанне загучыць —
табой.
Вачыма прачытай
жаданне
і будзь са мной
да развітання —
да скону ночы
будзь са мной!

---

[1] Solus cum sola (лац.) — пачатак крылатага лацінскага выслоўя «Solus cum sola non cogitabuntur orare “Pater noster”» («Мужчына з жанчынай сам-насам не падумаюць чытаць “Ойча наш”»).

Вазьмі мяне ў свой
вір ці вырай,
да беспрытомнасці —
бяры!
Няхай згарыць душа жывая
за недазволены парыў...

Пакуль не пакарае ранне
за грэх салодкі —
будзь са мной!
Па вуснах прачытай жаданне
і будзь са мной
да развітання —
да ночы скону
будзь са мной!

Авісага

Танкарукая жрыца,
апякунка стагоддзяў,
у Господняй гасподзе
непрывечаны госць,
ні сястра, ні царыца —
безгалосая птушка —
там, дзе сцюжна і скрушна,
засяваю мілосць.

Побач дыхаюць эры
і ўзіраюцца лёсы
ва ўладарныя кросны
у чаканні ахвяр,
ды замкнёныя дзверы
у бязмернае сэрца,
і так цяжка сагрэцца,
мой нязведаны Цар!

* * *

Вясна.
Вуснам
Цесна.

* * *

Калі маё жыццё свой шлях завершыць,
Пакінуўшы пасля сябе прабел,
Я ўсе мае пакутлівыя вершы
Аддам табе.

Калі мой дух з зямнога вавілону
Памкнецца ў Абяцаную Зямлю,
Я буду аднаму табе па сконе
Спяваць «Люблю».

* * *

Поўня на тое і поўня, каб поўнаю быць,
Каб не застацца паловай, самотнай паловай.
Сэрца, сапсутае сэрца, нясцерпна свярбіць,
Аж раздзіраюцца грудзі ад праведных словаў.

Чыстая жонка, сястра ад зямлі і травы,
Слухаю вуснамі цёплую музыку душаў...
Дзесьці празрыста ўзрастаеце — здзейснены —
Вы!
Поўня запомніць свайго непаўторнага мужа.

* * *

Нашае першае лета — і на Эверэсце!
Гэтак адразу — на самай узвышанай кропцы!
Мне ні патрэбы ў табе не было, ні прароцтваў,
Толькі душа, спарахнелая дзесьці ў сусвеце.

Хай ты мой пройгрыш сістэмам усіх
каардынатаў,
Хай разляцеліся дахі агнямі імгненняў,
Я ўжо не выпраўлю гэты закляты вынятак,
Згодная лепей на зман, але не на замену...

* * *

Абагомлю цябе, абанёлю —
Хай не спіцца, як рэжуцца крылцы.
Нам ужо не з'яднацца, не зліцца,
Але я не чакаю спатолі.

Абанёлю цябе, узвялічу —
Прарасці ўва мне першасным дрэвам.
Я табе не багіня, не Ева,
Але зорнае маю аблічча

І гляджу ў твае вокны да рання —
Бессаромная небная хамка...
Чуеш, любы, маю калыханку?
Беззаконне маё... Беззаганне!..

* * *

Мае новыя вочы, што носяць тваё імя,
Пазіраюць, як Буда, палохаюць, як Іегова.
Маё новае горла скаўтнула стары камяк,
У маім новым почырку подых —
таксама новы.
Хай учора мой дзень турбаваўся і выгараў,
Прыпадаў да зямлі пад жыцця
непад'ёмнай ношай…
Сёння ты — мой Алімп, мая Мекка і Матхура,
А пасля — хоць патоп, хоць утопія,
мой апошні!..

* * *

Шоргат сораму — не нагода
Адпускаць зваяваны вырай.
Пальцы мерзнуць — дык што за мода
Ад агню закрывацца шырмай
Недарэчнасцяў-небаракаў?
Мы іх кінем сляпым і дурням!
Я жадаю квітнець і плакаць
Над тваёй светаноснай скурай…

* * *

Можа, ты на адлегласці выцягнутай рукі,
Толькі б выцягнуць мне руку кіламетраў
на трыста...
Засынае насенне цела ў чаканні твіста
Неўтрымальных далоняў... І мне ўсё адно,
па кім
Зазвініць той апошні звон на сыходзе дзён,
Калі мы ўваскрасаем першымі тут і зараз...
Праз мільёны дарог (ні хваробы, ні смерць,
ні старасць!)
Я гляджу на цябе і квітнее — шчаслівы — Ён!

* * *

ужо леташнім стала летняе
ужо просіцца восень петлямі
запаветны мой запазычаны
незлічальны звычайна лічбава
бліскавічным агнём народжаны
заяснеў над усімі кожнымі
і няма ні дарог ні роздуму
толькі музыка толькі позірк твой

* * *

Як гарэлі далоні, як вусны хапалі паветра,
каб хапіла,
каб выпіць да дна гэты роспачны крок,
як стаяла пад небам твая прагнарукая
Федра
і спазняўся з адказам пакрыўджаны
стомлены Бог,
як у трызненне белых ваўкоў закрадаліся
жніўні,
як пад вокнамі гучна здзіўляўся збянтэжаны
люд —
я пра ўсё раскажу табе, мілы, а ты раскажы
мне,
як бурштынавым ранкам зямлю абуджае
«люблю»,
як штовечар ты слухаеш зорак маўклівае
сола
і вышукваеш спадчыну поўні ў чырвоным
віне,
як дагэтуль ёсць толькі надзея, прыгоства
і голас,
і сусвет па-ранейшаму — цуд,
але ўжо без мяне...

* * *

Загартуй і выратуй,
Некрануты вырай мой,
Роўны сонму сейбітаў,
Сеючых надзейнае!

Разгарні і вычытай,
Што на сэрцы вышыта,
Што пад сэрцам — новае...
Вырай невымоўны мой...

Пагарым і сцішымся —
Попел стане вішнямі,
Сэрцы стануць квеценем —
Расцвітай і ў смерці мне...

* * *

Сонца ўзыходзіць над Вашым плячом,
Ранак пусціла фіранка скрозь пальцы...
Дзесьці натоўпяцца шэрыя пляцы,
Дзесьці сумуе наш будучы дом,
Дзесьці дзяржавы знікаюць, а мы
Зноўку жывыя, што б нам ні казалі, —
Выспаліся.
І на пару згрызаем
Ранішні яблык, каханнем памыты...

* * *

Я, можа, буду Будам,
толькі — заўжды закаханым...
Будучыню забуду,
раны з грудзяў дастану,
стану ўсміхацца кожным —
нават скажоным — тварам
(кожны з далоні Божай
выслізнуў у сансару),
выдалю ўсе жаданні.
толькі адно пакіну:
каб невымоўным раннем
зноў нарадзіць бы сына...
Буду і Будай, можа...
Толькі дазволь — закаханым...
Толькі дазволь, харошы мой...
Дар мой неспадзяваны!

ПАЛЫН

* * *

Гарады дагары нагамі.
Дагары нагамі мы самі.
Дагарым. І гарады з намі.
Амэн.

Навагодняе

Чалавек чалавеку воўк —
Век за векам за вока вока.
Ні Закону нам, ні Прарокаў,
Толькі прага сваіх зубоў.

Мы стагоддзямі ладзім фэст
Моцных нюхам і кіпцюрамі,
Доўга песцім, ды хутка ранім:
Homo homini lupus est[1].

Да зямлі апусціўшы хвост,
Сваёй звыклай жыццёвай ноччу
Я завыю з тугі — па-воўчы —
І прыму гэты просты хрост.

Бо на кожнага свой хамут,
Колькі сам ад сябе не ўтойвай!
Мой драпежнік, мой браце, хто я?
І навошта мы? І каму?

[1] Homo homini lupus est (лац.) — чалавек чалавеку воўк.

* * *

Калі мы ходзім па вадзе,
мы снім Айца, мы снім Айчыну...
І пасміхаецца Адзіны
ў сваім ніколі і нідзе.

* * *

Калі не зашываецца адчай,
А рвецца на нянавісцяў мільярды,
Мне ўвесь наш вырай — Божа, выбачай —
Здаецца несапраўдным і нявартым...
І хоць не пераконваецца мозг,
І свет людскі — адно сырое мяса,
Даруй мне ўсё, прашу, і дай мне моц,
Каб выдыхнуць, узняцца і застацца...

* * *

У белым пакоі белыя людзі,
Белыя ўсмешкі на белых тварах,
Белыя словы: цуда не будзе,
Там за парканам — адно пачвары,
Там за парканам — адно свет белы:
Чорныя вокны, нямыя дахі...
Крылы збінтуем, ложак пасцелім,
Спіце спакойна, дурныя птахі,
Спіце-прысніце сад дзівосны,
Любых і верных, што ёсць — і разам...
Хай вас люляе птушыны востраў,
Покуль не скончыцца доза казак...

Малітва

Вызвалі мяне, выпусці
гэтыя ружы і кіпцюры,
бо й дагары нагамі літасці
прагну, а думалася:
ўгару
буду расці
ды згару!
І думаць няма аб чым болей...
Сціскае скроні,
у роце — зямля,
дык сёння апошняе тра-ля-ля
хай пальцы спяюць нежывой паперы...
Веру і так, што не маю меры,
што не маю адпяюць душу
гэтыя проста шчаслівыя людзі...
Дык будзь што будзе.
Adieu![1] Забудзьма
кепскую спробу стварыць мой сусвет.
Вызвалі, адпусці,
вазьмі мяне:
усім і ўсяму я кажу «Не!»

[1] Adieu! (англ.) — бывайце!

* * *

Нікуды не ад'ехаць!
За якія агрэхі
на такія арэхі
дасталося нам?

Што не едзем, а ходзім,
што не ўмеем па модзе,
я крычу сваю споведзь
усім гарадам!

Што і днём, што і ноччу
свой кавалак сірочы
толькі хочам і хочам
аддаць, змяняць

на маленькае мала
(і не рухнуцца шалі),
ды ў нябёсныя хвалі
плыве зямля...

І так хутка, так шпарка
увіхаецца Парка,
і цяжэе на карку
гадоў гмах.

І так нітка прадзецца,
што калі й давядзецца
нам падацца-падзецца,
дык у той шлях...

* * *

Яўрэйскім могілкам горада Рагачова

Над рукой Дняпра
узышло крыло
нерухомым пер'ем
каменных плітаў —
нерухомым пер'ем
сыноў Давіда,
адляцелых у залаты
шалом.

Над рукой Дняпра,
бы нямы папрок,
палеглі калісьці жывыя
сэрцы
і апошні сціплы прэзент —
бяссмерце —
ім прынёс адзіны наведнік —
Бог.

Дом

1

Восенню лепшы сон — сын.
Восенню лепшы стан — тын
выцягнутых угару душ.
Восень ахутвае, як муж,
і авалодвае, як смерць.
Восенню я не хачу мецць,
кінуўшы далечыні дол.
Восенню першы сум — дом.

2

Сёлета дом мой — дым.
Сёлета дзень мой — сон.
Цешацца гарады
з гэтакіх аксіём.

Выціснуцца б назад
з чэрава горадоў!
Сёлета сон мой — сад.
Сёлета сум мой — дом,

дом і за домам — сад
(лепш за пасады цуд!),
вырвацца б
за фасад,
за мітусні прысуд,

дзе каранямі ўглыб
душаў квітнее сад...
Госпадзе, спапялі
сёлетні лістапад!

3

Мару аб доме
з потам і бытам.
Так пра абдоймы —
Афрадыта,

гэтак нябёсы
сніць Ікар,
лепшыя лёсы —
зямны шар,

гэтак згарала
хіба Федра...
Марная справа —
свайго метра

вычакаць
з варыва
гарадоў.
Марная мара —
зямны дом.

* * *

Застаёмся нязграбнымі глупствамі мовы,
Не зважаючы ўпарта на знакі прыпынку.
Жыхары недарэчнасцяў шматпавярховых,
Павярхоўных пытанняў глухія скарынкі...

Застаёмся, каб тут не застацца ніколі
І — блюзнерам ці верным — сысці па законе,
Бо душа прагне поля, зямля прагне солі,
І далёка сягае струменьчык эонаў...

* * *

Я. Летаву

Да яснага Стыксу
выходзяць жыццёвыя лёхі...
Складае валізку
апошняе сэрца эпохі.

Складае далоні
апошні задзірысты лямант.
А нейкае сёння
сядзіць па гарэлачных крамах,

а нейкае заўтра
нясецца ў сваю павуціну
і б'ецца заўзята
за новага штучнага сына...

І збітая кожным,
распнутая векам іконаў,
так бездапаможна
гукае «мая абарона»...

Развітанне з Радзімай

Сланы ляцелі сумнай чарадой,
пранізваў неба плач іерыхонскі...
Сланы ляцелі з Індыі абдой-
маў да краёў свіных-качыных-конскіх...

...Ужо намацаў глебу дзіўны сон,
растаў вушыны подзвіг на світанні...
І толькі самы несуцешны слон
не мог паверыць у сваё расстанне...

Да Дняпра

Дамы-дамавіны
цябе залепяць,
мой сумны, мой слынны
страцім-лебедзь...

І над паваротам
святой пекнаты
дамы-бегемоты
разявяць раты.

На хвалях шэдэўра
з мільёнаў паўтонаў
дамы-проста-зебры
паўстануць шаблонна.

На тлустых абедах
узрошчваць праграэс
дамы-дамаседы
рассядуцца спрэс!

Няўмольна бяздомных
(у *свой* час!)
дамы-мажардомы
сажруць нас!

Майсей

Майсей, мой сейбіт,
Далёка золак,
Староты сполах
За Вашай спінай…

Сінайскім хлебам
Карміць галовы —
Такія ўмовы
Вам даў Адзіны.

Майсей, скажыце,
Ці сорак многа,
Калі да Бога,
Як па патэльні?

Ці хопіць жыццяў
І Вашых зерняў
На горкі тэрмін
Шляху ў пустэльні?

Але на голас
Вы гола выйшлі,
Каб з Усявышнім
Стаяць сам-насам,

Каб кожны кволы
Засвоіў крокі
Услед Прароку
І Кнізе часу…

Маўчаць стагоддзі,
Драбнее след Ваш,
Крыўляе сцежка
Ў палон бур’яну…

І хто адродзіць
Ваш добры подзвіг
І дасць мне сподзеў
На Абяцанне?..

* * *

...і пасыплюцца радкі
з апусцелых рукавоў,
замаркоціцца мой кіт,
змоўкне даўганогі воўк,
дзесьці адцвіце міндаль,
ну а тут — у краі заячым —
зразумеўшы, мой каваль
выйдзе ў поле і заплача...

РЫБЫ

На тым баку

Я буду чакаць вас, пакуль трываю,
Я буду чакаць вас — на тым баку.
Таму не жадаю казаць «бывайце»,
Таму, як заўсёды, кажу «пакуль».

На тым баку я паўстану новай,
Схаваўшы ў Лету пакутаў бруд.
На тым баку я спаткаю Слова,
Жывое Слова — мой родны кут.

Я буду чакаць вас — наскрозь жывая.
Я буду чакаць вас — на тым баку.
Таму не жадаю казаць «бывайце»,
Таму, як заўсёды, кажу «пакуль».

Вершы

Вершы-вершнікі,
зухаў рух,
вамі цешацца
руны рук.

Вершы — вернікі
ўсіх дарог!
Толькі бераг —
далее Бог,

толькі мера —
памрэ маяк,
вершы ж вернуць нас
на свая,

бо няпрошаных
ваяры,
непарушны апошні
Рым!

Верасень

Веру Верасню
гаспадару.
З цемры шэрасцяў
вырву рух —
вырву Верасень
з цвердзі дзён!
Там на беразе —
легіён,
там — прыгнечаны
дол жыцця,
тут — стрыечная
неба — я.
Вырву Верасень
(веры сінь!),
з цвердзі шэрасцяў —
неба плынь...

* * *

Верасень — вершы.
Кастрычнік — казкі.
Лістапад — лісты
з вершамі,
казкамі,
лісцем маіх рук...

* * *

Глінтвейнам Верленавых вершаў
сцякаецца вечар.
Нам схема да скону: кунежыць,
калечыць і кленчыць,
нам змены адмерана меней,
чым хочам і можам,
камусьці акцёрам на сцэне,
камусьці — у ложы.

Завеі Верленавых зоваў
атульваюць вочы...
Калісьці мы злучымся ў слове,
мой сябар, мой змоўшчык,
мой ключ да навоштага сёння,
да простага досыць.
Абсэнтам Верленавых сноў
набліжаецца восень...

* * *

Золак, малаком заліты…
Абдымаю неба грудзі.
П'ю цябе за літрам літр,
Мой звычайны новы будзень!

Будзе дзень, як сотні іншых, —
Непаўторны і ўлюбёны.
Зноў здаецца, што Ўсявышні
Мне ўсміхаецца спрасоння...

Я люблю яго малітвай,
Бо мне большага не трэба:
Золак, малаком заліты,
Маладыя грудзі неба.

Аляксандру Башлачову

1

Іншым няма нішаў і дышляў.
Іншым жыццё богам выйшла.
Іншым адзіны шлях — слых.
Іншы адтуліннаму жаніх.
Іншы адтульняму — сын, дух.
Іншы трымае замест дзвюх
рук за плячыма пакрой крыл.
Іншаму бачныя: свет, Рым,
скрыўленых твараў сляпы крок.
Іншаму — слых, каб у тых — зрок
працверазеў і зірнуў: дрэнь!
Іншы настолькі прарос карэн-
нем — пацягні, і Расія ўся
з таго карэння высееццa...
Іншаму ўзрошчваць для ўсіх сляпых.
Іншыя лічаць адно слупы
на непрацяглым шляху жыцця.
Іншым працяглы адно працяг.
Іншым — імша, калі ўсім — парад.
Іншым — прайсці між чужых «ура!»
і, атрымаўшы апошні план,
кінуць зямным толькі цень крыла.

Арфей

2

Я тут Эўрыдыка. А Вы тады дзе?
У Царстве якіх жывых?
Няхай неба Вас сюды не прывядзе,
Мой неактуальны жаніх!..

Ці, можа навострана сэрца ізноў
Складаць грамавы спеў?
Шукаеце вушы дачок, сыноў?
А мы — адно цень, пень...

А мы па калена ў нечым стаім:
Навошта ісці? Зямля
Сама, куды трэба, ідзе... А мы
Так любім глядзець здаля,

І твар не адводзіць, і ў вус не дзьмуць,
Сціскаючы свой трафей!
Няхай Вас нябёсы адсюль адвядуць,
Мой неактуальны Арфей...

* * *

Выспай устану з далоняў твайго акіяну,
Богу на рукі ўсхаплюся расплюшчаным
тварам,
Выкіну ўсё, чым мы ўнізе бяздумна цяжарым,
Стану, як ціша, як найдасканалае, стану!

Кім мы былі і якія багомілі гульні?
Скідвалі простых, любілі чужых і пярэстых.
Нам не надарыўся гонар прыйсці і
ўваскрэснуць —
Толькі прайсці, як праходзяць і ролі, і кулі...

Толькі цягнуцца бясконца нязграбінай-шыяй
Да спадзяваных далоняў, да вечнага ўсміху...
Госпадзе, як жа ў цябе тут і ясна, і ціха,
Я б засталася, Ўсявышні, на гэтых вышынях...

* * *

Заліўная папера: Дняпром шматрадковым
разліцца б...
Ды сціскаецца дых, і ў нямым
захапленні сплываю,
Каб ізноў нарадзіцца, ізноў на дзяўчынкавых
крылцах
Даляцець вокамгненна да Конга
ці да Парагваю,
Каб, заплюшчыўшы вочы, мінаць
безыменных маньякаў,
Заклапочаных зайздрасцю, жыць
па сезоне і модзе,
Каб трымаць свой сусвет, як заўсёды,
крыху не ў парадку,
Быць, як сораму волат, як першае
«будзе!» і «годзе!»

* * *

Големы нам завяшчалі знямелае:
цэглу без голасу, рэбры без Еваў.
Мы ж аддзялялі ад шэрага белае
вершастваральным акордам залеваў,
слухалі ўсхліпванне глебы высокае,
снілі стракатых дарог алілуйя,
мерылі вонкавых ранамі-вокнамі,
сэрцамі ўсмоктвалі срэбныя кулі...

* * *

рыбы пазяхаюць: — «Хто ты?..»
голас, дайце мне голас — голай!
пад маўклівым зямным сумётам
як я вытрымаю голад
безрадкоўя і бясслоўя —
спрэс мелодыя, спрэс горла?
там, дзе выйдуць усе высновы,
кіньце голас мне, каб не ўмёрла.

Лета

Летам Харон хварэе на дэжавю.
Лета як лета: слёзы, пялёсткі, усплёскі,
ноч раздзірае сузор'ямі галаву
і заглядаецца ў душы нібы па-свойску...

Але такі не новы мой сум і жаль,
так захліпаецца бераг спрадвечнай нотай,
што нават словы кладуцца ў знаёмы жанр
і да знаёмага вабяць пяяць і лётаць...

* * *

Прывароржаныя дарогамі,
Непрыкаяныя двухногія,
Абмінуўшы пустое многае,
Мы шукаем свой дом і лёс.

У спаборніцтве з вечнай шэрасцю
Мы трымаемся толькі вернасцю,
Блаславіў нас самотнік-верасень,
Добрай восені сумны ксёндз...

І пакуль драбяза — царыцаю,
Не змірыцца і не змарыцца нам,
Бо з такіх дапатопных рыцараў
Мы ствараем сваіх багоў,

Што ляцім на спатканне з марамі
Наваяўленымі ікарамі,
Каб пакінуўшы абцяжараных,
І дапіць, і дажыць нагбом!

* * *

Там — без мяне — уздыхвае зямля,
Насычаная пахамі вясновымі,
А мы сядзім замурзанымі совамі
І слухаем няўрымслівых крыўляк.

У марнасці хімераў-гарадоў
Ім застаецца толькі пырскаць слінаю,
А нам — люляць далонямі савінымі
Танклявы навароджаны радок...

* * *

Саламеі перагарэлі,
Адгарлалі сваё грахі,
За абветранай шырмай веяў
Акрыяла мая Рахіль.

І ў даўно занядбаным храме
Заяснеў спадзяваны сын.
Хай не прыйдзе ні сонца маме —
Толькі здзейсніўся б Біньямін...

* * *

Люты мне латы шые,
Люты — маё золата!
Выцягваю ў неба шыю,
Ратуючыся ад холаду,
І холад выходзіць вонкі —
Стаю, быццам баба снежная…
Вось-вось… і пачну старонку!
Вясновую — новую — лепшую!

НОТЫ

Нота лепшая

Калыхала Лея немаўля,
паставала сонейка ў далонях...
Слухала пранікліва зямля,
як пяяла праведнае ўлонне,
як сусвет, уздыхваючы ў такт
непадробнай мацярынскай ноце,
радаваўся так, што Сам Мастак
забываўся аб сваёй самоце...

Нота Марыніна. 31 жніўня

Нота Одзіна, нота адзіная —
Адзіноты маёй немата...
Буйнавокае сола савінае
Да сасны, да сястры, да куста...
А хацела ж і неба, і філіна
Да птушыных грудзей прытуляць,
Ды на ўзгорку застыла рабінаю —
Толькі неба цяпер і абняць...

* * *

Уласнай каінскай рукою
сябе адрэзаць ад спакою,
закатаваць сябе да болю
непрадказальнаю сабою
і ў гэтай ярасці бязбожнай
забыць, што трэба, а што можна,
каб выліцца дажджом адчайным
і зноў здабыць сваё маўчанне...

* * *

Горад усіх чужых
Збудаваў мне сцэну.
Мой камертон — уздых
Гэтых моцных сценаў.

Горад чужых адных,
Адкажы, навошта
Носіш так часта сны
І не носіш пошту?

Не адпускаеш жыць,
Даючы так поўна,
Горад такіх чужых
Чалавечых чоўнаў...

Сам сабе цар і мур —
Бездакорны горад!
Дар мой, скажы, чаму
Ты мне стаў на горла?

* * *

...А там плывуць кіты і ты —
вялікіх рыб вялікі нераст,
а я ад смутку і слаты
паціху тут сыходжу ў верас,
і мне знайсці ваш акіян —
як заснавацелю Маконда —
такі адчай, такі туман,
што нават спіцца безвыходна...

* * *

Прыўзнятыя бровы дуброваў
здзіўляюцца новым будоўлям,
а нам — збудаваным са словаў —
будоўлямі поўняцца поўні,
а нам — баламутам і блазнам —
сусвет адкрываецца кніжкай,
складаецца ў зорныя пазлы
і рукі даверліва ліжа...

* * *

...Каб наш размах не перабольшаў
размаху тонкага крыла.
Каб я, як раніца ці вожык,
заўсёды сённяшняй была.

А калі нітка дапрадзецца,
як схопіць іншая пара,
вазьмі маё жывое сэрца
і пахавай на дне Дняпра:

там скрозь празрыстыя сялібы —
з пакоя ў царственны пакой —
верлібрамі сплываюць рыбы
ў бясконцай прастаце сваёй!..

Змест

Літаратурна-мастацкае выданне

НАСТА КУДАСАВА
(Кудасава Настасся Фёдараўна)

РЫБЫ

Адказны за выпуск *І. В. Рэзько*

Падпісана да друку 03.01.2013. Фармат 70×90$^1/_{32}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,58. Тыраж 300 экз. Заказ 28.

ТАА «Харвест». ЛВ № 02330/0494377 ад 16.03.2009.
Вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.